Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 10:10:38

DOI:10.17951/sb.2025.19.249-258
Studia Białorutenistyczne 19/2025 REVIEWS
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Hanna Mikhalchuk

The Institute of Literary Research of the Polish Academy of Sciences, Warsaw (Poland)
e-mail: hanna.mikhalchuk@ibl.waw.pl
https://orcid.org/0009-0003-1209-0744

Погребняк Олена, *Новітня білоруська література у взаєминах з українською літературою: навчальний посібник*, Бланк-Прес, Київ 2023, 384 с.

Pohrebnyak Olena, "Modern Belarusian literature in interaction with Ukrainian literature: a textbook", Blank-Press, Kyiv 2023, p. 384

Pogrebnyak Olena, Współczesna literatura białoruska w porównaniu z literaturą ukraińską: podręcznik, Blank-Press, Kijów 2023, s. 384

Нягледзячы на тое, што навучальныя дапаможнікі традыцыйна арыентаваныя пераважна на задавальненне практычных патрэб навучальнага працэсу, асобныя з іх спрыяюць не толькі сістэматызацыі, але і паглыбленню ведаў у адпаведнай навуковай дысцыпліне, уносячы тым самым важкі ўклад у фарміраванне і развіццё акадэмічнага дыялогу ў яе межах. Менавіта да такіх выданняў варта аднесці кнігу ўкраінскай даследчыцы Алены Пагрэбняк *Новітня білоруська література у взаєминах з українською літературою: навчальний посібник* [*Найноўшая беларуская літаратура ва ўзаемаадносінах з украінскай літаратурай: навучальны дапаможнік*], якая была выдадзена ў Кіеве, у 2023 годзе.

Як адзначана ў прадмове да выдання, „запропонований навчальний посібник є першою у вітчизняній [украінскай – заўвага Г. М.] славістиці спробою узагальнити і систематизувати окремі положення аналітичних досліджень новітнього білоруського літературного процесу" (с. 10). Неабходнасць выканання дадзенай працы „назріла з огляду на понад десять років функціонування освітніх програм із білорусистики у Київському національному університеті імені Тараса Шевченка[1],

[1] У 2009 годзе ў Кіеўскім нацыянальным універсітэце імя Тараса Шаўчэнкі быў адчынены Цэнтр беларускай мовы і культуры імя Уладзіміра Караткевіча. У 2010–2011 навучальным

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 10:10:38

накопичений досвід викладацької та наукової роботи, і зумовлена відсутністю базових українських підручників з історії білоруської літератури" (с. 10).

У навучальным дапаможніку А. Пагрэбняк, такім чынам, „подається комплексний матеріал для вивчення дисциплін літературознавчого циклу, передбачених навчальним планом фахової підготовки магістрів філології кафедри слов'янської філології за спеціальністю 035 «Філологія (035.031 слов'янські мови та літератури (переклад включно), перша – білоруська)»" (с. 2). Дапаможнік прызначаны „для студентів-славістів, аспірантів, викладачів філологічних та інших гуманітарних факультетів, де вивчається література і культура слов'янських народів, передусім – для здобувачів другого рівня вищої освіти за освітньо-науковою програмою «Східнослов'янська філологія та англійська мова: теоретичні і прикладні студії: білоруська та українська мови і літератури»" (с. 5), у межах якой прадугледжана засваенне комплекснай дысцыпліны „Новітня білоруська література у взаєминах із українським літературним процесом" (с. 5). Адпаведна, структура дапаможніка „продиктована логікою викладу навчального матеріалу" (с. 9). Дапамоднік складаецца з дзесяці тэматычных раздзелаў-лекцый, планаў семінарскіх заняткаў, якія, з аднаго боку, рэзаніруюць з асноўнай тэматыкай раздзелаў, але адначасова адкрываюць новыя перспектывы для больш глыбокага разумення вывучаемых тэм і з'яў і разлічаны на стымуляванне самастойнай працы студэнтаў. А таксама – з дадаткаў.

У прадмове прадстаўлены характарыстыка і асноўныя мэты дысцыпліны, для якой ствараўся дапаможнік, акрэслены канцэптуальныя і структурныя асаблівасці выдання, названы аўтары, чые тэарэтычна-метадалагічныя і гісторыка-літаратурныя працы былі выкарыстаны пры падрыхтоўцы матэрыялаў (Васіль Будны, Тамара Гундарава, Дзмітрый Налівайка, Рыгор Піўтарак, Вячаслаў Лявіцкі, Аксана Бязлепкіна, Пётр Васючэнка, Таццяна Кабржыцкая, Вячаслаў Рагойша, Людміла Сінькова, Анджэла Мельнікава і інш.). Адзначана, у прыватнасці, што тэматыка раздзелаў-лекцый і матэрыялы „обиралися з урахуванням рекомендацій навчальних програм гуманітарних факультетів білоруських вищих навчальних закладів із сучасної білоруської літератури та порівняльного літературознавства, виданих в останні роки. При доборі художніх творів головним критерієм була їх естетична довершеність і самобутність, включеність у сучасний історико-літературний і літературознавчий дискурс, а також відповідність тематиці розділу" (с. 9). У сваю чаргу „у виборі наукових текстів перевага надавалася ґрунтовним працям із виразними і оригінальними висновками, які належать авторитетним білоруським дослідникам вітчизняної літератури XXI століття" (с. 9–10).

годзе быў праведзены першы набор студэнтаў на спецыяльнасць "Беларуская мова і літаратура, украінская мова і літаратура, англійская мова" (бакалаўрыят) [спасылка дададзена мной – Г. М.].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 10:10:38

Канцэпцыя дапаможніка, згодна з прадмовай, прадугледжвае „виявлення своєрідних напрямків, тенденцій, особливостей розвитку літератури незалежної Білорусі у проєкції на український літературний процес, з огляду як на історичні традиції кількасотлітньої культурної і політичної взаємодії, так і на єдність «стартових позицій», відправного пункту у новітній історії цих літератур" (с. 7). У той жа час звернута ўвага, што „концепція посібника передбачає певну авторську суб'єктивність у доборі тем, авторів і творів, які аналізуються, а об'єм викладеного матеріалу не може претендувати на повноту охоплення художніх явищ та їх можливих інтерпретацій" (с. 10).

Змест дапаможніка і яго праблемна-тэматычны фокус адлюстраваны ў назвах раздзелаў-лекцый: 1. *Білоруська література як об'єкт компаративістики* [*Беларуская літаратура як аб'ект кампаратывістыкі*], 2. *Білоруський літературний процес кінця XX століття на тлі епохи* [*Беларускі літаратурны працэс канца XX стагоддзя на фоне эпохі*], 3. *Чорнобильський дискурс у літературі білорусів і українців* [*Чарнобыльскі дыскурс ў літаратуры беларусаў і ўкраінцаў*], 4. *Творчі пошуки покоління 1990-х: неоавангард, транслогізм, постмодернізм* [*Творчыя пошукі пакалення 1990-х гадоў: неаавангардызм, транслагізм, постмадэрнізм*], 5. *Ігровий модус білоруської літератури постмодерної доби* [*Гульнёвы модус беларускай літаратуры постмадэрнага перыяду*], 6. *Проблематизація ідентичності в сучасних білоруських антиутопіях* [*Праблематызацыя ідэнтычнасці ў сучасных беларускіх антыўтопіях*], 7. *У пошуках нового героя. Літературний образ білоруса крізь призму імагології* [*У пошуках новага героя. Літаратурны вобраз беларуса праз прызму імагалогіі*], 8. *„Український текст" і білоруський контекст: новітня історія* [*„Украінскі тэкст" і беларускі кантэкст: найноўная гісторыя*], 9. *Творча спадщина Т. Шевченка в культурному ландшафті сучасної Білорусі* [*Творчая спадчына Т. Шаўчэнкі ў культурным ландшафце Беларусі*], 10. *Рецепція білоруської літератури в Україні XXI століття: напрямки і досягнення* [*Рэцэпцыя беларускай літаратуры ва Украіне XXI стагоддзя: напрамкі і дасягненні*]. Кожны раздзел-лекцыя заканчваецца пытаннямі для самакантролю, заданнямі для самастойнай працы, а таксама пералікам рэкамендаванай літаратуры па тэме.

Высновы, аналіз і інтэрпрэтацыя матэрыялу ў раздзелах-лекцыях апіраюцца на шырокі корпус аўтарытэтных даследаванняў беларускіх і ўкраінскіх навукоўцаў. Прыведзеныя аўтаркай сцверджанні паслядоўна падмацоўваюцца адпаведнымі спасылкамі, што садзейнічае фарміраванню ў чытача дакладнага ўяўлення пра літаратуразнаўчы кантэкст, на якім яны грунтуюцца. Сярод беларускіх даследчыкаў, на працы якіх спасылаецца А. Пагрэбняк, – імёны Людмілы Сіньковай, Аксаны Бязлепкінай, Ганны Кісліцынай, Анджэлы Мельнікавай, Пятра Васючэнкі, Івана Штэйнера, Ірыны Шаўляковай-Барзенкі, Вячаслава Рагойшы, Таццяны Кабржыцкай і мн. інш. Дапаможнік, аднак, не зводзіцца да простага рэфератыўнага агляду: аўтарская канцэпцыя забяспечвае комплекснае

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 10:10:38

і сістэмнае асэнсаванне матэрыялу, дапоўненае ўласнымі інтэрпрэтацыямі. Акрамя таго дапаможнік вылучаецца арыгінальнасцю падыходаў і навізной у асвятленні заяўленых тэм і праблемаў.

Так, напрыклад, адна з найбольш цікавых і пазнавальных лекцый у дапаможніку – лекцыя *У пошуках нового героя. Літературний образ білоруса крізь призму імагології* – заснавана на ўласных імагалагічных даследаваннях аўтаркі. На шырокім параўнальным матэрыяле (польская, чэшская, украінская і беларуская літаратуры) разгорнута глыбокая рэфлексія над праблемай вобраза беларуса і Беларусі. Аўтарка аналізуе не толькі вобраз беларуса ў іншаславянскіх літаратурах, але і асаблівасці фарміравання аўтавобразу ў сучаснай беларускай прозе і паэзіі (творы Альгерда Бахарэвіча, Пятра Васючэнка, Святланы Алексіевіч), у тым ліку практыкі дэканструкцыі і пераасэнсавання архаізаваных аўтавобразаў беларусаў (на прыкладзе вершаў Андрэя Хадановіча (*Дурка беларуская*), Ігара Сідарука (*А хто там ня йдзе* [Не-Купала]), Юрыя Гуменюка (*Слімакі*), Лявона Вольскага (*А хто там ідзе*)). Такая шматпланавая перспектыва, а таксама разнастайнасць выкарыстанага матэрыялу дазваляе ўсебакова асэнсаваць працэсы ідэнтыфікацыі і самаўспрымання беларусаў і Беларусі ў сучасным літаратурным кантэксце, выявіць тыпалагічную блізкасць і спецыфіку іх рэпрэзентацыі. Асабліва каштоўным з'яўляецца імкненне аўтаркі не толькі да ўласна тэкставага аналізу, але і да асэнсавання ідэалагічных, культурных і гістарычных кантэкстаў, у якіх гэтыя вобразы фарміруюцца і функцыянуюць.

Увогуле, улік спецыфікі беларускага сацыякультурнага і сацыялінгвістычнага кантэксту пры аналізе літаратурных твораў і мастацкіх з'яў – адзін з найбольш моцных бакоў дапаможніка. Аўтарка разглядае тэксты, як і асобныя мастацкія з'явы, у іх цеснай сувязі з грамадска-культурнымі, а таксама сацыяльна-палітычнымі працэсамі, а не ізалявана. Аналіз асобных твораў суправаджаецца звесткамі пра гісторыю іх выдання, атрыманыя ўзнагароды, рэцэпцыю, крытычныя водгукі. Такі падыход спрыяе глыбейшаму асэнсаванню перадумоў узнікнення пэўных літаратурных з'яў і канкрэтных тэкстаў, а таксама глыбейшаму разуменню іх функцыі і ролі ў літаратурным і грамадскім працэсах свайго часу. У выніку чытач атрымлівае магчымасць убачыць канкрэтны літаратурны твор не толькі як эстэтычны аб'ект, але і як важную частку сацыяльна-культурнай камунікацыі свайго часу.

У прыватнасці, у раздзеле-лекцыі *Проблематизація ідентичності в сучасних білоруських антиутопіях* абгрунтоўваецца думка, што раманы Альгерда Бахарэвіча *Дзеці Аліндаркі* і *Сабакі Эўропы*, а таксама раманы Віктара Марціновіча *Мова*, Ганны Севярынец *Дзень Святога Патрыка* – „є не лише художнім артефактом, а й виявом соціальної відповідальності авторів, спробою зосередити увагу на кризових явищах і деструктивних процесах, які сьогодні відбуваються у білоруській культурі та білоруському суспільстві загалом" (с. 110). Выбар беларускай мовы як мовы творчасці, мастацкая распрацоўка

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 10:10:38

праблемы роднай мовы, канцэптуальнае ацэнсаванне праблем ідэнтычнасці паказаны ў раздзеле як важная частка мастацкай самаідэнтыфікацыі сучасных беларускіх аўтараў.

Аналізу ўласна антыўтопій у раздзеле папярэднічае грунтоўны і шматаспектны разгляд праблемы пошуку кода беларускай ідэнтычнасці ў беларускай літаратурна-філасофскай традыцыі на працягу ўсяго XX–XXI стагоддзя (на прыкладзе твораў Францішка Багушэвіча, Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага, Валянціна Акудовіча, Пятра Васючэнкі і інш.). Асаблівая ўвага ў гэтым кантэксце надаецца праблеме статусу беларускай мовы, экстралінгвістычным умовам яе функцыянавання ў грамадстве. З аднаго боку, абапіраючыся на адпаведныя крыніцы, А. Пагрэбняк адзначае шэраг праблем, уласцівых сучаснаму стану беларускамоўнай кнігі, у тым ліку зніжэнне чытацкага попыту і скарачэнне аб'ёмаў беларускамоўнай выдавецкай прадукцыі (с. 105–106). З іншага боку, канцэптуальнае асэнсаванне праблем беларускай ідэнтычнасці – моўнай і нацыянальнай – паказана ў раздзеле як жывы, няспынны, інтэлектуальна насычаны і надзвычай важны для сучаснай беларускай літаратуры працэс: і як трэнд, і як дамінантная аб'яднаўчая ідэя, вакол якой канцэнтруюцца творчыя пошукі сучасных літаратараў (с. 108–110). Вельмі дарэчна у раздзеле ўзгаданы сучасная эсэістыка (Валянцін Акудовіч, Ігар Бабкоў, Пятро Васючэнка, Леанід Галубовіч, Альгерд Бахарэвіч), акрэсленая „надзвычайно інформативним складником художньої самоідентифікації новітнього національного письменства„ (с. 108–109). А таксама – „Жывы Часопіс" (с. 109) – блог-сервіс, які ў першай дэкадзе XXI стагоддзя стаў важнай камунікацыйнай пляцоўкай для беларускіх аўтара і чытача.

Канцэптуальны падыход А. Пагрэбняк да вызначэння тэматыкі лекцый і семінарскіх заняткаў, пастаноўкі праблем і пытанняў, а таксама яе імкненне да ўсебаковага раскрыцця прапанаваных тэм праяўляецца на працягу ўсяго тэксту дапаможніка. Так, напрыклад, у якасці ілюстрацыі да лекцыі *„Український текст" і білоруський контекст: новітня історія* ў дадатку прадстаўлены ўрывак з рамана *Бодай, Будка* Наталкі Бабінай – ураджэнкі Берасцейшчыны з украінскай самаідэнтыфікацыяй, якая актыўна папулярызуе ўкраінскую літаратуру ў Беларусі. Раман, напісаны па-ўкраінску, спалучае элементы ўкраінскай літаратурнай мовы з дыялектнымі асаблівасцямі палескіх гаворак Берасцейшчыны і хранатопам, цесна звязаным з Беларуссю. Гэта робіць яго цікавай транснацыянальнай з'явай, якая аб'ядноўвае культурныя і моўныя традыцыі двух народаў і ўяўляе сабой цікавы матэрыял для аналізу і інтэрпрэтацыі ў межах навучальнай дзейнасці студэнтаў-філолагаў.

Раскрываючы тэму *Рецепція білоруської літератури в Україні XXI століття: напрямки і досягнення*, аўтарка асвятляе шырокі спектр самых разнастайных формаў узаемадзеяння паміж беларускімі і ўкраінскімі літаратарамі – ад перакладаў і публікацый беларускіх аўтараў ва ўкраінскіх выданнях да сумеснага

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 10:10:38

ўдзелу ў разнастайных літаратурных імпрэзах, паэтычных слэмах, міжнародных літаратурных фестывалях, праяваў салідарнасці ўкраінскіх творцаў з беларускімі літаратарамі і грамадскай супольнасцю.

Асабліва падрабязна асветлены „ўкраінскі шлях" літаратурнай дзейнасці Андрэя Хадановіча, творчасць якога, па-меркаванні аўтаркі дапаможніка, „можна розглядати як своєрідний місток, що нині об'єднує білоруську та українську літератури" (с. 184). Пры гэтым у дапаможніку робіцца акцэнт не толькі на гісторыі выдання асобных кніг паэта і перакладчыка, але і на іх рэцэпцыі, а таксама ролі асобных украінскіх аўтараў (Юрый Андруховіч, Сяргей Жадан, Аляксандр Ірванец, Іван Андрусяк) у папулярызацыі творчасці Андрэя Хадановіча ва Ўкраіне. Дзякуючы такому падыходу да падачы матэрыялу, вынікі рэцэпцыі паказаныя не толькі як вынік уласна літаратурных працэсаў, але і як праява міжасабовых сувязяў і творчага ўзаемадзеяння паміж аўтарамі.

Калі ўлічыць высокую інтэнсіўнасць беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязяў у першых двух дзесяцігоддзях XXI стагоддзя, якая ў значнай ступені вынікала з міжасабовых кантактаў і творчага ўзаемадзеяння паміж аўтарамі, узнікае натуральнае жаданне, каб гэты раздзел дапаможніка у перспектыве трансфармаваўся ў самастойнае манаграфічнае даследаванне, важнае для больш глыбокага асэнсавання сучаснага літаратурнага працэсу ў Беларусі.

Лічу вартым адзначыць, што ў цэлым, пры знаёмстве з тэкстам дапаможніка, адчуваецца, наколькі моцна яго змест, арганізацыя і форма падачы матэрыялаў абумоўлены спецыфікай фармату выдання. Фармат навучальнага дапаможніка відавочна абмяжоўвае магчымасці для поўнага раскрыцця навуковага патэнцыялу аўтаркі: многія з прадстаўленых у кнізе ў дастаткова кароткім выглядзе матэрыялаў, падраздзелаў, думак маглі б перарасці ў самастойныя, паўнавартасныя і навукова значныя часткі асобных навуковых манаграфічных даследаванняў.

Фактычна палову дапаможніка (усяго ён налічвае амаль 400 старонак) займаюць дадаткі, дзе прадстаўлены кароткія біяграфіі беларускіх і некаторых украінскіх пісьменнікаў, перакладчыкаў, даследчыкаў, а таксама іх тэксты – мастацкія творы або літаратуразнаўчыя артыкулы. Дадаткі перадусім выконваюць функцыю своеасаблівага ілюстрацыйнага матэрыялу да канкрэтных лекцый. Разам з тым прадстаўленыя ў гэтым раздзеле матэрыялы ўяўляюць цікавасць як самастойны канцэптуальны элемент дапаможніка – рэпрэзентатыўны корпус тэкстаў, сфармаваны з улікам аўтарскай арыентацыі ў сучасным літаратурным працэсе і акадэмічным літаратуразнаўчым дыскурсе. Ён, сярод іншага, адлюстроўвае і суб'ектыўнае бачанне стану і тэндэнцый развіцця сучаснай беларускай літаратуры, абумоўленае прафесійнымі ведамі і даследчым вопытам аўтаркі. І можна сказаць, што дадаткі не толькі арганічна дапаўняюць асноўны курс, але і выконваюць функцыю своеасаблівай хрэстаматыі, якая чытаецца з не меншай цікавасцю, чым змест лекцый.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 10:10:38

У сувязі з абмежаванай даступнасцю дапаможніка, лічу мэтазгодным уключыць у рэцэнзію пералік адабраных аўтараў і твораў. Прадстаўлены корпус тэкстаў можа разглядацца як своеасаблівы – натуральна, вельмі ўмоўны – канон, на падставе якога замежныя студэнты маюць магчымасць пазнаёміцца з некаторымі тэндэнцыямі сучаснага беларускага літаратурнага працэсу, а таксама акадэмічнага дыскурсу.

Такім чынам, у дадатках прадстаўлены (цалкам альбо ва ўрыўках):

– навуковыя артыкулы – Вячаслава Рагойшы (*На перасячэнні славянскіх традыцый: верш Максіма Багдановіча*), Людмілы Сіньковай (*Літаратура нацыянальная альбо гетэрагенная*), Таццяны Кабржыцкай (*Тарас Шаўчэнка: нацыянальная характаралогія, запарожскае казацтва і творчы метад пісьменніка* Таццяны Кабржыцкай);

– эсэ – Сяргея Дубаўца (*Новая культурная сітуацыя*), Юрася Пацюпы (*Постмадэрнізм, калыска мая*), Пятра Васючэнка (*Беларус вачыма беларуса*), Альгерда Бахарэвіча (*Бог ня роўна delete (Францішак Башугэвіч)* з кнігі *Гамбурскі рахунак Бахарэвіча*);

– нарысы – Віктара Казько (*Сенакос у канцы красавіка*), Сяргея Балахонава (нарысы-містыфікацыі *Гомельскі сьлед Францішка Скарыны*, *Зямля пад крыламі фенікса*);

– урыўкі з раманаў Альгерда Бахарэвіча (*Дзеці Аліндаркі*), Людмілы Рублеўскай (*Авантуры Драгуна Пранцішка Вырвіча*), Наталкі Бабінай (*Бодай, Будка*);

– урывак з п'есы Ігара Сідарука *Галава*;

– вершы Тараса Шаўчэнкі ў перакладзе на беларускую мову Валерыя Стралко;

– вершы Анатоля Сыса, Уладзіміра Някляева, Андрэя Хадановіча (у арыгінале);

– вершы беларускіх аўтараў (Уладзімір Караткевіч, Міхась Стральцоў, Серж Мінскевіч, Андрэй Хадановіч, Альгерд Бахарэвіч, Віктар Жыбуль, Юля Цімафеева, Алесь Плотка, Алесь Емяльянаў-Шыловіч, Уладзь Лянкевіч, Антон Рудак, Крысціна Бандурына, Артур Камароўскі) у перакладах на ўкраінскую Вячаслава Лявіцкага.

Немалаважна і тое, што мастацкія тэксты на беларускай мове пададзены з захаваннем асаблівасцяў аўтарскага правапісу. Адпаведна, у дапаможніку прадстаўлены творы, напісаныя як на наркамаўцы, так і на тарашкевіцы (творы Сяргея Балахонава, Андрэя Хадановіча, Альгерда Бахарэвіча), што выдатна адлюстроўвае моўную і правапісную разнастайнасць сучаснага беларускага літаратурнага поля.

Адабраныя матэрыялы сведчаць пра прафесійную эрудыцыю А. Пагрэбняк, дэманструюць яе ўменне (а таксама жаданне) адсочваць інфармацыю пра найноўшыя пераклады з беларускай на ўкраінскую, якія распаўсюджваюцца

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 10:10:38

ў самых разнастайных медыя – традыцыйных літаратурных газетах, інтэрнэт-рэсурсах і на асабістых старонках перакладчыкаў у сацыяльных сетках. Кожнае цытаванне мастацкіх тэкстаў суправаджаецца спасылкай на крыніцу, прычым часта – на электронны рэсурс, напрыклад: інтэрнэт-газета *Майдан*, старонка Вячаслава Лявіцкага ў Facebook, анлайн-часопіс перакладной паэзіі *Umbrella*, вэбсайт часопіса *Kyiv Daily*. Гэта заўважны плюс выдання, бо сярод іншага дапамагае сфарміраваць пэўнае ўяўленне пра пляцоўкі, якія ў XXI стагоддзі служылі асяроддзем для папулярызацыі беларускай літаратуры ва ўкраінскай прасторы.

Сярод крыніц, на якія аўтарка спасылаецца, прыводзячы беларускія тэксты, часта сустракаецца электронны рэсурс knihi.com (Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка). Як бы парадаксальна гэта ні выглядала на першы погляд (паколькі традыцыйна перавага аддаецца папяровым выданням), спасылкі на электронную бібліятэку таксама бачацца як заўважны плюс выдання. Knihi.com – адзін з найбольш змястоўных і багатых на сучасны момант электронных рэсурсаў, дзе прадстаўлены не толькі творы беларускай мастацкай літаратуры, але і падручнікі, слоўнікі, навуковыя і папулярна-навуковыя выданні. Доступ да папяровых выданняў сучаснай беларускай літаратуры нават у межах беларускіх бібліятэк не заўсёды просты, а ў замежных установах – часта ўвогуле абмежаваны або немагчымы. Адпаведна спасылка на электронную бібліятэку у навучальным дапаможніку для замежных студэнтаў не толькі забяспечвае аператыўны доступ да тэксту, але і стварае дадатковыя магчымасці для азнаямлення з новымі аўтарамі і іх творамі.

Натуральна, што корпус тэкстаў, з якімі павінен азнаёміцца студэнт падчас вывучэння курса сучаснай беларускай літаратуры, не абмяжоўваецца толькі матэрыяламі, прадстаўленымі ў дадатках. Праграма курса – і гэта перадусім адлюстроўваецца ў лекцыйным матэрыяле, суправаджальных пытаннях і заданнях да лекцый і семінарскіх заняткаў – разлічана на глыбокае і шматбаковае вывучэнне сучаснай беларускай літаратурнай прасторы. Сярод аўтараў, чыя творчасць аналізуецца альбо ўзгадваецца ў якасці прыкладаў у межах лекцыйнага курса, – Алесь Разанаў, Алесь Адамовіч, Анатоль Сыс, Святлана Алексіевіч, Васіль Быкаў, Іван Пташнікаў, Зміцер Вішнёў, Ілля Сін, Валянцін Акудовіч, Ігар Бабкоў, Ганна Севярынец, Віктар Марціновіч, Адам Глобус, Сяргей Кавалёў, Андрэй Хадановіч, Альгерд Бахарэвіч, Ігар Сідарук, Віктар Жыбуль, Дзмітрый Строцаў, Людміла Рублеўская, Серж Мінскевіч, Андрэй Федарэнка, Сяргей Балахонаў, Вальжына Морт, Ева Вежнавец, Уладзімір Някляеў, Уладзімір Арлоў і мн. інш. Згадваюцца і імёны прадстаўнікоў больш маладога, якія дэбютавалі пасля 2000-га года, пакалення літаратараў – Наста Кудасава, Юля Цімафеева, Уладзь Лянкевіч, Сяргей Прылуцкі, Марыя Мартысевіч, Віталь Рыжкоў і інш.

На маю думку, аўтары і творы, прадстаўленыя ў дапаможніку, з'яўляюцца рэпрэзентатыўнымі для асэнсавання асноўных накірункаў сучаснай беларускай

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 10:10:38

літаратуры, адлюстроўваюць яе тэматычную і стылістычную разнастайнасць і забяспечваюць магчымасць паглыбленага аналізу ключавых праблем і феноменаў, актуальных для найноўшага беларускага літаратурнага дыскурсу. Прадстаўленая ў дапаможніку канцэпцыя падбору матэрыялу сведчыць аб глыбокім разуменні аўтаркай асноўных тэндэнцый і спецыфікі развіцця беларускай літаратуры, выдатнай арыентацыі ў матэрыяле, у тым ліку ў найноўшых публікацыях, а таксама – аб добра развітай прафесійнай інтуіцыі і літаратурным гусце.

Аб'ём праробленай даследчыцай працы становіцца яшчэ больш відавочным, калі ўлічыць, што на сённяшні момант у беларускім літаратуразнаўстве адсутнічае кананічная абагульняльная праца – накшталт спецыялізаванага акадэмічнага выдання ці ўніверсітэцкага навучальнага дапаможніка, – цалкам прысвечаная гісторыі найноўшай (перадусім 2000–2025-я гады) беларускай літаратуры. Наяўны навуковы даробак у гэтай галіне пераважна прадстаўлены навуковымі артыкуламі, раздзеламі ў калектыўных манаграфіях, а таксама асобнымі манаграфічнымі даследаваннямі, якія закранаюць толькі пэўныя аспекты гісторыі беларускай літаратуры XXI ст. і не ахопліваюць гэтую тэму ў сістэмным, храналагічна ўпарадкаваным і канцэптуальна цэласным выглядзе.

А. Пагрэбняк, такім чынам, мусіла правесці сапраўды вялікую сінкрэтычна-аналітычную працу, каб інтэграваць разнастайныя падыходы і крыніцы ў адзінае канцэптуальнае поле і адаптаваць вынікі гэтай працы пад фармат навучальнага дапаможніка.

Варта звярнуць увагу і на тое, што навучальны дапаможнік А. Пагрэбняк быў напісаны без якіх-кольвек цэнзурных абмежаванняў – ні негалосных (калі даследчык піша са свядомасцю, што ёсць пэўнае кола аўтараў, творчасць якіх непажаданая для падрабязнага разгляду), ані рэальных (маецца на ўвазе створаны беларускімі ўладамі пасля падзей 2020 года спіс экстрымістаў і экстрымісцкіх матэрыялаў). Як вынік – у дапаможніку прадстаўлены значны аб'ём, новай, датычнай у тым ліку беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязяў пачатку трэцяй дэкады XXI ст., інфармацыі, якая ў цяперашніх умовах – грамадска-палітычны крызіс, выкліканы падзеямі жніўня 2000-га году, паўнамаштабная вайна паміж Расіяй і Украінай, забарона ўвозу ва Украіну выдавецкай прадукцыі з Беларусі (указ, падпісаны ў чэрвені 2023 года) – магла б папросту не трапіць на старонкі літаратуразнаўчых выданняў і з часам згубіцца.

Фактычна адзінай заўвагай, якую бачыцца мэтазгодным адзначыць у рэцэнзіі, з'яўляецца непаслядоўнасць у перападачы асабістых назваў. Часта пры першым упамінанні не распрываецца поўнае імя аўтара, даследчыка, а падаецца толькі ініцыял. Такая практыка прыводзіць да стылістычнай неаднароднасці тэксту, а таксама можа выклікаць блытаніну ва ўспрыманні інфармацыі. Напрыклад, у выпадку з Ф. Чарнышэвічам нераскрыты ініцыял можа стварыць ў чытача ўражанне, што маецца на ўвазе Фларыян Чарнышэвічам, хоць насамрэч гаворка ідзе пра іншага, менш вядомага шырокай публіцы, пісьменніка – Фёдара

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 10:10:38

Чарнышэвіча (с. 168). І ў цэлым было б добра, калі б імёны згаданых у кнізе даследчыкаў, аўтараў, выкладчыкаў пры першай узгадцы падаваліся ў поўнай форме. Як бачна, прыведзеныя заўвагі галоўным чынам адносяцца да стыль-рэдактарскай апрацоўкі тэксту і не закранаюць яго канцэптуальнае або зместавае напаўненне.

Такім чынам, дапаможнік А. Пагрэбняк *Новітня білоруська література у взаєминах з українською літературою* спалучае глыбокі аналітычны падыход з навізной і арыгінальнасцю інтэрпрэтацый. Выданне адкрывае шырокую перспектыву для міжкультурнага дыялогу, спрыяе паглыбленню разумення ўзаемадзеяння дзвюх літаратур, што робіць яго каштоўным не толькі для знаёмства з беларуска-ўкраінскімі літаратурнымі сувязямі, але і для больш глыбокага разумення спецыфікі найноўшага літаратурнага працэсу ў Беларусі.

Як адзначыла сама даследчыца ў прадмове да выдання, і з чым складана не пагадзіцца, „ретельний зважений аналіз суспільно-політичних обставин розвитку білоруської культури останніх десятиліть мають і матимуть вирішальне значення для збереження нашого міжлітературного діалогу і простору порозуміння в майбутньому" (с. 9). На фоне актуальнай сітуацыі абмежаванасці міжкультурнага і акадэмічнага дыялогу паміж Беларуссю і Украінай з'яўленне дапаможніка А. Пагрэбняк варта расцэньваць як асабліва значную і своечасовую з'яву.